Жураў В.А., студ. гр. 304 ФКіСКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.,
ст. выкладчык

# ЗБІРАЛЬНІК СКАРБАЎ НАРОДНАЙ ПЕСНІ – РЫГОР РАМАНАВІЧ ШЫРМА

Практычна да XX ст. беларуская музыка развівалася пераважна ў форме вуснай народнай творчасці. Народная музыка (музычна фальклор, вакальная і музычна-інструментальная народная творчасць) існавала ў непарыўнай сувязі з духоўнай і сацыяльнай сферай дзейнасці чалавека. Творы народнай музыкі ўзнікалі на аснове мастацкіх традыцый, адлюстроўваючы калектыўна выпрацаваныя эстэтычныя прынцыпы працоўнага народа.

На працягу 19 стагоддзя з бяздоннай крыніцы беларускай народнай музыкі чэрпалі натхненне і багата карысталіся нашымі скарбамі прадстаўнікі польскай і расійскай музычнай культуры – Манюшка, Карловіч, Глінка. Сярод інтэрпрэтацый беларускай народнай музыкі былі не толькі кампазітар Агрэнеў-Славінскі, рабіў апрацоўкі беларускіх песень “Ці не дудка мая”, “Чалавек жонку б’е-бічуе”, “Чаму мне не пець”, разлічаныя на тое, каб пасмяшыць і здзівіць публіку “беларускім мужыком”.

Але і ў той далёкі час былі кампазітары, якія праўдзіва, на высокім мастацкім ўзроўні, паказвалі Беларусь у сваёй творчасці. Так, напрыклад, як народныя песні “Ды хто, ды хто”, “Чорныя вочы” і народная сюіта “Каханне”, уквечаныя формамі гармоніі ў творчасці кампазітара, прафесара Галкоўскага, які не парушаў народнай мелодыі, доўгі час не выходзілі з рэпертуару канцэртаў у Вільні, Беластоку і іншых гарадах.

Прыход Галкоўскага ў беларускую музыку быў вельмі карысны: ён адразу вывеў беларускую музыку ў “сялянку-прыгажуню”. Ён зрабіў 54 гарманізацыі для невялікага змешанага хору, 17 для вялікага, 3 для жаночага, 3 для мужчынскага, 22 сольныя песні для высакага голасу з акампанементам і 2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народныя сюіты “Дуда” і “Каханне”. Ён першым на Захадзе Беларусі даў музыку на паэзію Купалы і Коласа.

Украінскія кампазітары з Амерыкі А. Кошыц і М. Гайваронскі падаравалі Беларусі незраўнаныя па свайму маста- цтву аранжаменты беларускіх песень. Прафесар А. Кошыц зрабіў дзесяць аранжаментаў, кожны з якіх шэдэўр харавой мастацкай літаратуры.

Кампазітар М. Гайваронскі даў трынаццаць аранжаментаў для змешанага хору і пяць для жаночага. Найлепшыя з іх калядкі: “Ой, загуду”(сіроцкая, сола сапрона з хорам), “Лявоніха”, “Ой, гукнула сыраежка” (жніўная), “Ой, у полі дзве птушачкі” (рэкруцкая), і валачабныя– “Як пайшоў Мікола” і “Ой, ляцелі ды два галубочкі”. Апрача гэтага М. Гайваронскі стварыў харавую музыку на вершы беларускіх паэтаў: М. Танка “Спакойна дрэмле Нарач” і “Пройдуць гады”, Я. Коласа – “ Месяц ” і П. Труса жаночы хор “Дзве вярбы”. Кожны з гэтых твораў глыбока прадуманы і музыка цесна сплецена з тэкстам.

Выступленні слаўнага спевака Міхала Забэйды-Суміцкага, які ў канцэртных залах і па радыё так хораша выконваў беларускія народныя песні, раскрылі перад усім культурным светам музычнае багацце беларускага народа.

Новы этап творчага асэнсавання беларускай музычнай песеннай культуры распачынае Рыгор Раманавіч Шырма – знакаміты беларускі харавы дырыжор,фальклярыст,грамадскі і музычны дзеяч, публіцыст, літаратуразнавец.

Адной з самых значных карэспандэнтак Рыгора Шырмы была Захвея Хвораст, якая хавала ў сабе багатую беларускую песню каб аддаць яе на ўцеху і радасць добрым людзям. Сама ж яна ў юнацтве прайшла цяжкую школу жыцця – дзяўчнкай працавала ў панскіх маёнтках ад зары і да зары. Ад яе Шырма запісаў поўны вясельны абрад з песнямі і прыказкамі. Багатая памяць Захвеі Хвораст зберагла беларускаму песеннаму мастацтву, звыш 150 розных мелодый, з якіх многія ўвайшлі ў рэпертуар пеўчых каляктываў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апрача Захвеі Хвораст назаўсёды зберагглі ў памяці спевакі і спявачкі з народа, народныя аржаменты: Наталля Хадзінская з вёскі Новыя Зімодры Маладзечанскай вобласці, Тарэн Карпюк з вёскі Страшава былога Ваўкавыскага павету, Луцэя Рэдзька з вёскі Карэлічы на Дзісеншчыне, Васіль Скурко з Навасёлак на Пастаўшчыне і цэлая плеяда маладых талентаў ва ўсіх кутках Савецкай Беларусі. Іх вуснамі народ расказваў пра сябе, пра сваю журбу, радасць і аб усім тым, што жыло ў іх марах.

Гэтае бязмернае багацце народна-песеннага скарба было сабрана Рыгорам Раманавічам і пакладзена ў залатую скарбніцу беларускага народнага фальклёру. Толкі ён любоўна паклаў туды звыш трох тысяч мелодый і тэкстаў да іх, з якіх больш за 1,5 тысяч мелодый надрукаваў. У тым ліку і народную мелодыю на словы М. Багдановіча “Зорка Венера”, запісаную на Навагрудчыне, якая стала потым патрэатычным сімвалам Беларусі.

Прафесійныя апрацоўкі беларускіх народных песень, пачынаючы з 20 гадоў, Шырма правяраў у створаных ім харах: у 1923 годзе упершым хоры, арганізаваным у Пружанах, потым у 1931-39 гадах у Віленскім хоры пры Беларускім Студэнцкім Саюзе, які ўнёс вялікі ўклад у папулірызацыю і збіранне народных мелодый . Там адбывалася збіранне народных мелодый (больш тысячы ): адтуль ішлі ніці злучаючыя з беларускай песняй вялікіх прадстаўнікоў музычнай культуры, якія падыходзілі да працы з народнай творчасцю з агульналюдской увагай: іх цікавілі не палітычныя тэндэнцыі, а тая адвечная краса песні, якая была закладзена ў душы беларускага народа. Пасля таго, як у гэтым хоры стаў прымаць ўдзел выдатны саліст-інтэрпрэтатар народных песень Міхась Забэйда-Суміцкі, хор стаў выдатнай мастацкаў з’явай у Заходняй Беларусі.

Новыя творчыя гарызонты адкрыла перад майстрам харавых спеваў вызваленне Заходняй Беларусі. Ужо першага Лістапада 1939 года Шырма атрымаў мандат на стварэнне прафесійнага калектыва – Беларускага ансамбля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

песні і тінца, які ужо у 1940 годзе з вялікім поспехом выступіў у Мінску, Беластоку а у Маі 1941 года – на дэкадзе беларускага мастацтва у Маскве.

Вялікая Айчынная вайна застала ансамбль песні і танца ў Расіі, дзе ён працягваў гастраляваць аж да 1944 года.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны у 1951 годзе беларускі ансамбль песні і танца быў перайменаваны ў Дзяржаўны хор БССР. У 1955 годзе, пасля паспяховага выступлення на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, Рыгору Раманавічу Шырме было прысвоена званне Народны артыст СССР, а калектыў быў прызнаны лепшым прафесійным хорам краіны, якому ў 1957 годзе было дадзена званне Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР.

Да 1970 года Рыгор Раманавіч паспяхова кіраваў калектывам, які, амаль, усе называлі капэлай Шырмы. Ні адзін канцэрт "капэлы Шырмы" у той час не праходзіў без выдатных беларускіх народных песень.

Як і раней, Рыгор Раманавіч увесь час шмат клапаціўся аб стварэнні і выданні высокамастацкіх апрацовак беларускіх народных песень. Добры іх знаўца, ён ведаў якому кампазітару мажна даверыць тую ці іншую песьню, каб не абламаць яе жывых парасткаў. Апрацоўкі, якія прайшлі мастацкую апрабацыю ў капэле, ён надрукаваў у зборніках "Выбраныя песні з рэпертуару Дзяржаўнага хору БССР" (1958) і "Спявае Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР" (1966). Завяршылася ўся гэта велізарная праца выданнем у 1972 і 1974 гадах двух фундаментальных тамоў "Беларускія народныя песні ў апрацоўцы для хору", куды ўвайшлі 217 разнастайных работ, да стварэння якіх Шырма далучыў 44 кампазітары Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, Эстоніі і Латвіі. Лепшымі сярод іх Шырма назваў апрацоўкі А.Грачанінава, А. Багатырова і А. Пашчанкі. Выхад двухтомніка адкрыў магчымасці для шырокага культурнага ўзаемаабмену з другімі народамі СССР. Заканамерным было прысуджанне Шырме за яго стварэнне Дзяржаўнай прэміі БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новыя творчыя магчымасці адкрыліся ў савецкі час перад Р.Р.Шырмай – збіральнікам песеннага фальклору. Тысячы яго запісаў становяцца каштоўнейшымі зборнікамі. Шырма выдатна занатаваў багацейшую ў славянскім свеце, пра што сведчыў міру яшчэ Адам Міцкевіч, песеннасць беларусаў, збярог яе ад забыцця і перадаў у мастацкую практыку.

Першым яго песенным зборнікам сталі "Беларускія народныя песні, загадкі і прыказкі" (1947). Але і гэты зборнік і наступны - "Беларускія народныя песні" 1955 года з-за адсутнасці паліграфічнай базы былі выдадзены без нот. Толькі пасля востра-крытычнага выступлення Шырмы на III з'езде пісьменнікаў БССР у 1954 годзе і серыі артыкулаў аб няправільных адносінах да выдання фальклору, становішча змянілася. Новай з'явай сталі выдадзеныя у 1958 годзе ў Маскве з мелодыямі "Двесце беларускіх народных песень" Р.Шырмы, дзе аўтар прадставіў усесаюзнай навуковай і творчай грамадскасці паэтычнае і меладычнае багацце роднай песні.

Па справядлівай ацэнцы Н.Гілевіча, лепшым выданнем баларускіх народных песень з нотамі за ўсю гісторыю беларускай фалькларыстыкі стаў чатырохтомнік Шырмы "Беларускія народныя песні", асобныя тамы якога адпаведна выходзілі ў 1959, 1960, 1962 і 1976 гадах. Гэта вынік амаль 70-гадовай збіральніцкай і творчай дзейнасці Рыгора Раманавіча Шырмы.

Літаратура:

1. Шырма Р.Р. Беларускія народныя песні, т.1. Дзяржвыдавецтва БССР, Мінск, 1959.
2. Шырма Р.Р. Беларускія народныя песні, т.2. Дзяржвыдавецтва БССР, Мінск, 1960.
3. Шырма Р.Р. Беларускія народныя песні, т.3. Дзяржвыдавецтва БССР, Мінск, 1962.
4. Шырма Р.Р. Душа народа. – "Звязда", Мінск, 16.10.1955.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Шырма Р.Р. Беларуская народная песня. – “Беларусь”, №3, Мінск, 1944.
6. Нісневіч І.Н., Рыгор Раманавіч Шырма, “Музыка”, Ленінград, 1971.
7. Ліцвінка В.Дз., Рыгор Шырма, “Беларусь”, Мінск, 1990.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ